# РАЗДЕЛ II

# СОВРЕМЕННЫЕ ПРОБЛЕМЫ МЕТОДОЛОГИИ, ТЕОРИИ И ИСТОРИИ ГОСУДАРСТВА И ПРАВА

**УДК 342.5**

## СТАРАЖЫТНЫЯ ВЕЧА І «АБЛАСНЫЯ» СОЙМЫ XIII–XV СТСТ. ЯК ПЕРШЫЯ ІНСТЫТУТЫ НАРОДАЎЛАДДЗЯ І ПРАВАТВОРЧАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ

**Т. І. Доўнар**
*прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар юрыдычных навук, прафесар*
dovnar-taisa@rambler.ru

**Т. У. Іванова**
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
my@tatsianaivanova.ru

У працы разглядаюцца старажытныя веча і «абласныя» соймы XIII–XV стст. як праявы ранніх форм народнага ўдзелу ў палітычным жыцці Беларусі. Выяўляецца іх роля ў фарміраванні інстытутаў народнай улады і праватворчасці, аналізуецца структура, функцыі і механізмы прыняцця рашэнняў у гэтых органах. Адзначаецца, што веча і соймы заклалі аснову для далейшых форм прадстаўнічага ўдзелу і развіцця прававых норм у беларускім грамадстве.

**Ключавыя словы:** старажытнае веча; абласныя соймы; народная ўлада; праватворчасць; самакіраванне.

В статье рассматриваются древнее вече и «областные» соймы XIII–XV веков как проявления ранних форм народного участия в политической жизни Беларуси. Раскрывается их роль в формировании институтов народной власти и законотворчества, анализируются структура, функции и механизмы принятия решений в этих органах. Отмечается, что вече и соймы заложили основу для дальнейших форм представительного участия и развития правовых норм в белорусском обществе.

**Ключевые слова:** древнее вече; областные соймы; народная власть; законотворчество; самоуправление.

Гістарычныя дакументы сведчаць, што з даўніх часоў насельніцтва старажытных беларускіх княстваў-дзяржаў (Полацкай, Віцебскай, Смаленскай і інш.) збіралася для вырашэння важных жыццёвых пытанняў на агульныя сходы. Часцей за ўсё яны склікаліся з мэтай выбрання князёў, вырашэння пытанняў вайны і міру, прызначэння падаткаў.

Увогуле сістэма органаў дзяржаўнай улады ў старажытных беларускіх дзяржавах уяўляла сабой сукупнасць трох асноўных інстытутаў: князя, княжацкай рады і веча, якія

ў сваёй функцыянальнай дзейнасці ў значнай ступені залежалі адзін ад другога. Пры гэтым паўнамоцтвы князёў знаходзіліся ў асноўным у сферы выканаўча-распарадчай дзейнасці і яны амаль не валодалі правам прыняцця новых законаў. Такое права прызнавалася звычаем ў большасці за калегіяльнымі органамі і перш за ўсё за веча, якое і было на той час галоўным заканадаўчым органам. Як адзначаў А. Е. Праснякоў, князь – гэта «вождь и организатор народного ополчения, глава общего управления землей, защитник от внешней опасности и гарант внутреннего мира» [1, с.197]. Пры рашэнні ж галоўных дзяржаўных пытанняў князь вымушаны быў раіцца з «думчымі», «добрымі» мужамі, а з мэтай падтрымкі ўсяго насельніцтва – склікаць веча, у якім удзельнічала ўсё дарослае мужчынскае насельніцтва.

Пісьмовыя дакументы XIII–XV стст. сведчаць, што паўнапраўнымі ўдзельнікамі веча, якое найменавалася таксама на беларускіх землях словамі «снем», «капа», «купа» «сойм» і інш., звычаёвае права прызнавала вольных мужчын – дамаўласнікаў, не падпарадкаваных сямейнай уладзе. Напрыклад, жыхары Друцка, запрашаючы да сябе князя Рагвалода Барысавіча, гаварылі: «Приезжай, князь, не мешкай, рады мы тебе; если придется, станем биться за тебя и с детьми» [2, с.517]. Адсюль відаць, што бацькі рашалі і за паўналетніх дзяцей, якія ўжо былі здольныя ваяваць за інтарэсы князя.

На той час удзел у палітычным жыцці дзяржавы ўсіх паўнапраўных людзей з’яўляўся неабходнай умовай для належнага функцыянавання старажытнай дзяржаўнасці. Пры невялікім службовым апараце органы ўлады змушаны былі пастаянна шукаць падтрымкі ў насельніцтва і ўсе важныя пытанні дзяржаўнай палітыкі вырашаць толькі з яго згоды. Аднак, галоўнае месца на вечавых сходах з цягам часу пачало належыць феадальным вярхам. Рашэнні і пастановы пачалі прымацца часцей за ўсё па іх прапанове і жаданні, хоць і вырашаліся пытанні пераважнай большасцю галасоў усіх прысутных на веча. Як правіла, пры разыходжанні меркаванняў прымалася рашэнне, за якое выказалася найбольш моцная частка вечавога сходу, якая была ў стане схіліць (або прымусіць) астатніх пагадзіцца з іх прапановай.

Веча збіралася ў вызначаных месцах: у больш старажытны перыяд часцей за ўсё на месцах паганскіх капаўшчаў, пазней – каля царквы, на гандлёвых пляцах і інш. Як правіла, яно склікалася князем. Аднак веча лічылася правамоцным і тады, калі па якіх-небудзь прычынах збіралася стыхійна і не ў загадзя вызначаным (традыцыйным) месцы.

Нягледзячы на панаванне звычая ў старажытных дзяржавах, паступова павялічваецца роля пісаных законаў і ўзмацняецца праватворчая дзейнасць, аб чым сведчаць летапісы і іншыя гістарычныя крыніцы. Да нашага часу дайшла толькі невялікая частка самых старажытных пісаных помнікаў права Беларусі. Галоўным чынам гэта дагаворы аб палітыка-эканамічных адносінах беларускіх княстваў (Полацкага, Віцебскага, Смаленскага і інш.) з горадам Рыгай, саюзам прыбалтыйскіх гарадоў і нямецкімі купцамі [3, с. 11–12 і інш.]. Са зместу іх вынікае, што са старажытных часоў існавалі даволі ўстойлівыя гандлёвыя і дыпламатычныя сувязі паміж беларускімі княствамі і іншымі дзяржавамі, якія грунтаваліся на роўнасці правоў і абавязкаў іх удзельнікаў.

Кола пытанняў на веча не было строга азначана. Часцей вырашаліся найбольш важныя дзяржаўныя справы: абранне і зняцце з пасады (выгнанне) князя, прызначэнне на пасады вышэйшых службовых асоб і пазбаўленне іх гэтых пасад, пытанні вайны і міру,

міжнародныя адносіны, арганізацыя апалчэння і абароны, падаткі, важныя судовыя справы. На вечы маглі абмяркоўвацца і менш важныя пытанні. Пры гэтым часам веча і без князя магло вырашыць значныя дзяржаўныя пытанні, асабліва калі гэта тычылася вайсковых адносін з суседнімі землямі. Так, калі ў 1186 г. мяжу Полаччыны перайшлі войскі Смаленска і Ноўгарада, палачане, абмеркаваўшы сітуацыю на вечы, выбралі сваіх прадстаўнікоў, правялі перамовы і мірна ўрэгулявалі спрэчныя пытанні [4, с. 32].

Гісторыя існавання старажытных княстваў на Беларусі ведае перыяды, калі сістэма кіравання ў іх значна адрознівалася ад той, што склалася традыцыйна. Так, летапісы сведчаць, што некаторы час, пачынаючы з другой паловы XII ст., улада ў Полацку належала 30 «мужам», ці, як іх яшчэ называлі, «старцам». Напрыклад, у «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай» утрымліваюцца звесткі «о полоцкой свободности або Венеции». Там гаворыцца, што палачане «в той час волно собе пановали и жадной зверхности над собою не мели, тылко 30 мужов с посродку речи посполитой своей на поточные справы судей и сенаторов прекладали… все збиралися; там и о справах своих, и о потребах речи посполитое и держав своих радили, бо держали на той час землю Рускую сами мещане полоцкие… взявши кшталт справованя речи посполитой от оных славных справ грецких афиненов…» [5, с. 20–21]. Падобна на тое, што гэта быў орган накшталт «савету гаспод» Наўгародскай феадальнай рэспублікі. Тая ж хроніка гаворыць, што ў другой палове XIII ст. «полочане, гды ся в том Глебе остатный потомок князей полоцких з Литвы замкнул (бо без потомства умер), почали собе волно жити, а пана над собою не мели». Гэта значыць, што палачане самі без князя ў той час кіравалі ўласнай дзяржавай.

Паступова з узмацненнем расслаення грамадства і павелічэннем дзяржаўнага апарата змяншаецца значэнне простых людзей і ўзрастае роля кіруючых феадальных вярхоў, якім і належала праватворчасць. Менавіта таму веча становіцца менш патрэбным і яго паступова перастаюць склікаць.

Пры гэтым веча (соймы) на Беларусі працягвалі дзейнічаць і ў перыяд фарміравання Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ), у сувязі з чым вучоныя адзначалі, што агульнадзяржаўны (вальны) сойм, які склаўся значна пазней, вырас са старажытных вечавых сходаў.

На пачатковым этапе існавання ВКЛ, калі былыя старажытныя беларускія княствы і іншыя землі толькі пачалі кансалідавацца вакол Навагрудскага княства, тэрыторыя дзяржавы падзялялася яшчэ ўмоўна на землі цэнтральныя і прыслухоўваючыя. Менавіта больш на т.зв. прыслухоўваючых землях працягвалі дзейнічаць вечавыя сходы, а гэтымі землямі ў асноўным і былі старажытныя беларускіх княствы, што ўваходзілі ў склад новай дзяржавы на пэўных умовах. Аб гэтым сведчаць летапісныя звесткі і першыя заканадаўчыя акты новай дзяржавы. Так, водгукі старажытных вечавых парадкаў і соймавых сходаў (мабыць, словы «снем», «сойм» азначалі «скапленне народу») бачны ў заканадаўстве ВКЛ і ў першую чаргу ў так званых абласных граматах.

Вялікія князі вымушаны былі выдаваць абласныя граматы пры ўваходзе зямель (княстваў) у склад новай дзяржавы як неабходную ўмову ўзаемаадносін з насельніцтвам гэтых зямель. Аднак самыя першыя граматы да нашага часу не дайшлі. Захаваліся ў асноўным больш познія, пацвярджальныя граматы (Полацкай зямлі 1511, 1547, 1580, 1634 гг., Віцебскай зямлі 1503, 1509, 1561 гг., Смаленскай зямлі 1505 г.,

Драгічынскай зямлі 1511, 1547 гг. і інш.). Перш за ўсё гэтыя граматы мелі моц і значэнне старажытных мясцовых законаў. Таксама яны рэгламентавалі ўзаемаадносіны мясцовага насельніцтва з кіраўніцтвам ВКЛ і фактычна з'яўляліся вынікам кампрамісу паміж цэнтральнай уладай і жыхарамі гэтых старажытных княстваў. Так, вялікі князь абяцаў не ўмешвацца ў царкоўныя і судовыя справы гэтых зямель; павінен быў вызваліць жыхароў ад шэрага павіннасцей, прызнаваў за імі права свабоднага выезду з тэрыторыі дзяржавы, мог прызначыць ваяводу (замест былога мясцовага князя) са згоды насельніцтва і інш. Напрыклад, у Полацкай грамаце 1511 г. гаварылася: «Теж полочаном всим жити в Полоцку добровольно, покуль хто хочет; а будеть ли которому Полочанину от нас насильство, нам его силою не держати: ино ему путь чист, куды хто хочеть, без каждое зачепки» [3, с. 107].

Наяўнасць грамат, якія мелі дзяржаўна-прававы характар, сведчыць аб асаблівым становішчы гэтых зямель. Многія палажэнні грамат гавораць аб захаванні пэўнай зямлі як адзінага цэлага, як адасобленай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў складзе ВКЛ. Так, Вялікі князь абяцаў Вялікі князь абяцаў не ўмешвацца ў царкоўныя справы гэтых зямель, не пасылаць жыхароў гэтых зямель на пагранічную службу, не змяняць падаткаў, вызваляў жыхароў гэтых зямель ад шэрагу павіннасцей, за баярамі і мяшчанамі гэтых зямель прызнавалася права свабоднага выезду і інш. Напрыклад, у Віцебскай грамаце 1503 г. гаварылася: «В подводы коней в городских людей и в поселских путных не брати» [3, с. 95]. Аналагічнае палажэнне мела месца і ў іншых абласных граматах. Напрыклад, у Полацкай грамаце было запісана: «А в заставу нам бояр и мещан Полоцких и поселских путников не посылати», «давати нам воеводу нашого Полочаном по их воли; а который будеть воевода наш нелюб им, и нам воеводу дати по их воли» [3, с. 106–107]. Несумненна, усе гэтыя нормы мелі канстытуцыйны характар.

Увогуле абласныя граматы сведчаць, што гэтыя землі былі аўтаномнымі ў складзе ВКЛ і карысталіся асаблівымі правамі і ільготамі. Аўтаномны характар зямельвыразна праяўляўся ў заканадаўчым замацаванні ў асноўным нормаў мясцовага звычаевага права. Пра гэта гаворыць і даволі працяглая дзейнасць мясцовых вечавых сходаў – соймаў, якія пазней сталі галоўным узорам для ўтварэння вальнага сойму. Менавіта перш за ўсё на землях былых старажытных княстваў ў складзе ВКЛ досыць доўгі перыяд часу існуюць і дзейнічаюць т.зв. «абласныя» соймы (веча) У склад іх уваходзілі не толькі не толькі вышэйшыя службовыя асобы гэтых зямель, буйныя землеўладальнікі, але і іншыя свабодныя людзі, у тым ліку і гараджане, чорныя людзі, слугі. Увесь склад сойма называўся «паспольства», а ў яго складзе былі мужы старыя (старэйшыя) і меншыя. Мясцовыя соймы са старажытнасці вырашалі пытанні аб кіраванні дзяржавай, прыняцці заканадаўства, разглядалі судовыя справы, фінансавыя, ваенныя і інш. Пэўны час «абласныя» соймы (веча) існуюць і дзейнічаюць побач з агульнадзяржаўнымі соймамі, на якіх вырашаюцца важнейшыя пытанні: міжнароднай палітыкі і ваенных саюзаў з іншымі дзяржавамі, выбараў новага князя, падаткаў і інш.

Увогуле ж мясцовыя («абласныя») соймы сталі ўзорамі для стварэння агульнадзяржаўнага, т.зв. вальнага сойма ВКЛ, які склікаўся першапачаткова як пашыранае пасяджэнне рады. Так, у дакументах XV – першай паловы XVI стст. ўсё часцей гаворыцца аб скліканні пашыраных пасяджэнняў рады, якія называюцца: («зупольная рада»,

«з’еханне», «с’нем», «сойм», а часам – вялікі сойм). Такія соймы збіраліся для вырашэння важнейшых спраў адносна кіравання дзяржавай, асабліва пасля таго як вялікія князі па традыцыі станавіліся адначасова і каралямі Польшчы, перыядычна выязджаючы туды па справах, Ф. І. Леантовіч піша, што ва «удельную эпоху» дзейнічалі таксама соймы вялікіх і удзельных князеў па справах усіх, або некалькіх земляў, на якіх абмяркоўваліся галоўным чынам пытанні знешняй бяспекі. Напрыклад, саюз Княства з нямецкім ордэнам пры Міндоўгу і Вітаўце абмяркоўваў сойм, або ў 1379 г. мытны дагавор з крыжакамі абмяркоўваў сойм Ягайлы [6, с. 20–21]. Вучоны нават лічыць, што ў гэты перыяд існуюць і агульныя («вспольныя») соймы Вялікага княства з Польшчай, асабліва з пачаткам уній. У тым ліку і унія 1385 г. была заключана на агульным сойме, а з моманта заключэння Гарадзельскай уніі 1413 г. ўвогуле утвараюцца агульныя польска-літоўскія соймы. Ён адзначае і існаванне ў той перыяд ваенна-палявых або лагерных соймаў і прыводзіць прыклад 1432 г., калі быў заключаны дагавор з нямецкім ордэнам.

Аб пераўтварэнні ў перыяд вайны ваеннага лагеру ў сойм піша і Н. А. Максімейка, які адзначае, што менавіта такі сойм адбыўся ў Навагародку ў 1502 г., у Менску – у 1507 г., у Віцебску – у 1562 г. і інш. Таксама навукоўцам выказана думка, што ва ўдзельную эпоху узніклі соймы паноў-рады, якія называліся «зуполная рада», «з’еханне», «сойм», дзеля разгляду судовых спраў і пытанняў адносна кіравання дзяржавай [7, с. 75]. Падставай узнікнення такіх соймаў ён лічыць заснаванне трыбуналаў і іншых шляхецкіх судоў і адзначае, што ў Статутах 1566 і 1588 гг. аб асобных соймах паноў радных ужо не ўзгадваецца. Таксама Н. А. Максімейка на падставе аналіза матэрыялаў Літоўскай Метрыкі даказвае, што да канца XV ст. ў дзяржаве дзейнічалі толькі «абласныя» (мясцовыя) соймы – віцебскі, полацкі і інш. [7, с. 20, 75 і інш.].

Несумненна, кампетэнцыя агульнадзяржаўнага сойма выпрацоўвалася на працягу стагоддзяў пад уплывам практыкі дзейнасці «абластных соймаў». Сойм становіцца агульнадзяржаўным органам толькі тады, калі гэтыя землі падпарадкоўваюцца непасрэдна цэнтральнай уладзе і замест «абластных соймаў» узнікаюць мясцовыя шляхецкія соймікі, на якіх выбіраюцца па два дэлегаты (дэпутаты) ад паветаў на вальны сойм.

Трэба адзначыць, што да сярэдзіны 60-х гг. XVI ст. не існавала ніякіх агульных законаў, якія б вызначалі склад соймавых «станаў». Асабісты склад вальных соймаў вызначаўся пры іх скліканні спецыяльнымі ўрадавымі распараджэннямі. Першы Статут ВКЛ 1529 г., як адзначаюць даследчыкі, толькі ўпамінаў пра сойм. А ўжо тыя змены, што адбыліся ў сацыяльна-палітычным і эканамічным жыцці дзяржавы ў 40–50-ых гадах XVI ст., запатрабавалі ўдасканалення дзейнасці сойма і ўнясення зменаў у заканадаўства. У лістападзе 1551 г. ў сувязі з просьбай дэпутатаў сойма вялікі князь Жыгімонт Аўгуст са згоды паноў рады вырашыў утварыць соймавую камісію з дзесяці асобаў (пяць католікаў і пяць праваслаўных) для перагляду Статута 1529 г. Перад імі ставілася задача тэкст першага Статута «добра обачити и разважити и выразумети то, чого бы потреба была прибавити альбо убавити, альбо отменити» [4, с. 124]. На сойме 1565 г. шляхта зноў падымала пытанне аб рэфармаванні сойма, адпаведна чаму Віленскі прывілей 1565 г. заканадаўча замацаваў правіла склікання павятовых соймікаў за чатыры тыдні перад вальным соймам і абмеркавання на іх пытанняў, якія былі адзначаны ў вялікакняжацкіх лістах, а таксама выбрання на сойм двух павятовых дэпутатаў [8, с. 15]. Дэпутатам, якія былі абраныя на павятовых сойміках, даваліся пісьмовыя інструкцыі і даручэнні заяўляць і адстойваць на соймах тыя пытанні, якія былі вызначаны

на павятовых сойміках. У выніку права заканадаўчай ініцыятывы, якое пэўны час належыла вялікаму князю і радзе, на падставе Віленскага прывілея 1565 г. і Статута 1566 г. надаецца сойму. Так, у ім гаварылася: «При том тежъ уставуемъ, съ призволеньем радъ нашихъ духовныхъ и свѣцкихъ и зо всими станы сойму належачыми, на теперешнем сойму великомъ Виленскомъ, хотечы то все мѣти вѣчными часы, ижъ маемъ мы и потомки наши Великіе Князи Литовскіе съ потребы Речы Посполитое за радою радъ нашихъ того жъ панства, або за прозбою рыцерства, складати сеймы вальные въ томъ же панствѣ Великомъ Князствѣ Литовскомъ завжды, коли колко того будеть потреба» [8, р. III, арт.6]. З гэтага часу на вальным сойме абмяркоўваліся кандыдатуры і выбіраліся вялікія князі, вырашаліся фінансавыя і падаткавыя пытанні, міжнародныя справы адносна саюзаў, дагавораў, войнаў з іншымі дзяржавамі, разглядаліся некаторыя судовыя справы, а самае галоўнае – абмяркоўваліся і прымаліся заканадаўчыя акты.

Увогуле ўжо на стадыі свайго фарміравання агульнадзяржаўны сойм складаўся з трох частак (станаў): вялікага князя, рады і прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя. Вучоныя разыходзяцца ў поглядах адносна паўнамоцтваў «станаў» і кампетэнцыі самога сойма. Так, Н. А. Максімейка лічыў, што вялікі князь і станы былі роўнамоцнымі бакамі, якія мелі патрэбу адзін у адным і таму шляхам узаемных саступак прыходзілі да пагадненняў і хаця не было прававога прынцыпа аб вызначэнні таго, які бок павінен падпарадкоўвацца іншаму боку ў выпадку канфліктаў паміж імі, дзейнічаў рэгулятар фактычны – ваенная небяспека. Менавіта яна прымушала бакі саступаць адзін аднаму і шукаць кампраміс [8, с. 75 і інш.]. Хоць іншыя навукоўцы лічаць, што перавагу мелі князь і рада, на наш погляд, патрэбна улічваць час, калі адбываўся сойм, а таксама важнасць разглядаемага пытання.

У цэлым жа, сойм Вялікага княства Літоўскага як вышэйшы праватворчы орган дзяржавы фарміраваўся паступова на працягу XV – першай паловы XVI стст. на падставе дэмакратычных вечавых традыцый старажытных беларускіх княстваў і паралельна з працэсамі складвання цэнтралізаванай дзяржавы і саслоўнага падзелу грамадства. Канчаткова была заканадаўча замацавана праватворчая функцыя сойма Статутам 1566 г., што потым было пацверджана потым Статутам 1588 г. Працяглая ў часе і даволі прадукцыйная дзейнасць соймаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай сведчыць аб актыўныя развіцці на землях Беларусі парламентарызму, канстытуцыяналізму і народаўладдзя.

Некалькі пазней, на наступных гістарычных этапах развіцця Беларусі вечавыя дэмакратычныя традыцыі, выпрацаваныя на вечавых сходах, абласных соймах, а потым – агульнадзяржаўных (вальных) соймах, пераемна ўспрымаліся новымі дзяржаўнымі органамі. У тым ліку ў савецкі перыяд, калі пачалі дзейнічаць з’езды саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, а пазней саветы народных дэпутатаў і Вярхоўны савет БССР – тагачасныя паўнамоцныя, прадстаўнічыя органы народаўладдзя, якімі былі ўспрыняты дэмакратычныя прынцыпы дзейнасці папярэдніх органаў. Гэта тычыцца і сучаснага этапа развіцця Рэспублікі Беларусь. Менавіта лагічным працягам пераемнасці развіцця парламентарызму і народаўладдзя стала не толькі дзейнасць парламента Рэспублікі Беларусь, але і стварэнне Ўсебеларускага Народнага Сходу – новага канстытуцыйнага органа і важнейшага прававога інстытута ў структуры беларускай мадэлі дэмакратыі і механізма народаўладдзя.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Пресняков, А. Е. Лекции по русской истории. Т.1. Киевская Русь / А. Е. Пресняков. – М. : Соцэкгиз, 1938. – 282 с.

2. Соловьев, С. М. История России с древнейших времен / С. М. Соловьев. – М., 1959. – Кн. 1. – Т. 2. – 811 с.

3. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права: Дапаможнік / Я. Юхо, А. Абрамовіч, Т. Доўнар, У. Сатолін. – Мінск : БДУ, 2000. – 127 с.

4. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік / Т. І. Доўнар. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. – 416 с.

5. Хроника Литовская и Жмойтская… // Полное собрание русских летописей. – М., 1975. – Т. 32. – 234 с.

6. Леонтович, Ф. И. Веча, сеймы и сеймики в Великом княжестве Литовском / Ф. И. Леонтович // Журн. М-ва народного просвещения. – 1910. – № 2. – С. 23–274.

7. Максимейко, Н. А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н. А. Максимейко. – Харьков : Типография А. Дарре, 1902. – 205 с.

8. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г. / Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо; рэдкал. Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 352 с.